Покі жыцьцё стане йначэ,
І скрозь цемрадзь і гушчары,
Як луч сонейка праз хмары,
Сьвет нам не прарвецца.

**Якуб Колас.**

# Аб усім па троху.

### Эміграція.

У гэтым гаду шмат меней людзей выежджае у Амэрыку. Гэтак, за марэц месяц на параходах, што выезджаюць з Лібавы, выехало толькі 4,800 эмігрантоў, тады як летась за гэты-ж самы месяц выехало 8,600 душ. Гэтак сама меней выехало людзей проці леташняго і ў красавіку і маю. Тлумачуць гэта ня толькі безрабоцьцем у Амэрыцы, але такжэ і тым, што цяпер трудней дастаць эмігрантам заграпічны пашпарт. Цяпер пры выдачы заграпічнаго пашпарту вымагаюць ад селян усякіх «удостовѣреній», «разрѣшеній», «свидѣтельств» і інш. Асобам ад 18 да 21 году часам і саўсім не выдаюць заграпічных пашпартоў. Апрача гэтаго ад эмігрантоў вымагаюць мыта за кожнаго узрослаго члена сямьі асобна. Праз гэта большая частка эмігрантоў пераходзіць граніцу тайком і пасьля едуць у Амэрыку на нямецкіх караблях.

### Духавенсгва і казённые газэты.

У найсвяць. Сынод у апошніе часы находзіць багата звестак аб тым, што вясковае духавенства мала цікавіцца ня толькі правымі газэтамі, але і нават цэркоўнымі выдавецтвамі. Да правых газэт («Земшчына», «Русск. Знамя», «Голосъ Руси» і інш.) свяшчэннікі адносюцца іронічна і, не зважаючы ні на цыркуляры, ні на архіпастырскіе парады, адмаўляюцца выпісываць іх. Ні так даўно у рэдакцію «Церковн. Вѣд.» адзін протоерэй звярнуўся з дужа цікавай просьбай. «Прашу—пішэ ён—прысылаць «Церковн. Вѣд.» з разрэзанымі карцінамі: гэтым вы багата свяшчэннікоў звольніця ад цяжкой і некарыснай працы і заслужыцця ад іх шчырую падзяку».

### Агульна-національны армянскі зьезд.

Армянскіе газэты паднялі пытаньне аб скліканьню агульна-національнаго армянскаго зьезду дзеля абмяркаваньня спраў культурнаго жыцьця армянскіх народоў Газэты паказываюць на тое, што ужо адчуваецца патрэба у агульным злучэньню культурных сіл армянскаго народу. Між іншым будучы зьезд мае падняць пытаньня аб агульна-національным фондзе (капітале) на культурные патрэбы націі.

### Фонд ім. Шэвчэнкі.

Украінская газэта «Рада» падала думку, каб украінцы злажылі фонд на Шэвчэнка с катораго можна было-б выховываць бедных дзяцей у украінскім національным духу. Ведама, што народ, каторы змог сабраць на памятнік свайму генію з дробных складак больш 100 тысяч рублёў, патрапіць сабраць на гэткі жывы памятнік яму не малы фонд. Шчасць Божэ!

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Забастоўка.

У Вільні забаставалі работнікі шасці фабрык, яны дамагаюцца падвышэньня заработнай платы на 30 працэнтоў.

### Новые школы.

У Ново-Вілейцы с 1-го ліпня гэтаго году аткрываецца мужская вучыцельская сэмінарыя.

### Змаганьне с пьянствам.

= У мястэчку **Тургелі** Вілейскаго павету, на валасным сходзі пастаноўлена пазакрываць усе шынкі у воласці.
= У мястэчку **Лынгмянах**, Сьвенцянск. павету, сход пастанавіў закрыць с 1-го ліпня манапольку.

### Наша цвярозасць.

**Смургоні.** На тым тыдні земскі начальнік ненарокам залавіў валасных судзёў у карчме.

Ен быў непадалёку якраз, калі суддзі варочаючыся з мейсцоваго агляду, заехаліся да карчмы. Суддзі мелі адгавор што яны засьмяглі і згаладаліся, то ведама з гэтай патрэбы і зайшлі у карчму. Але земскі не заўважыў гэтаго і дваіх такі пасадзіў пад арэшт.

Бо ўжо надта сьмела яны ходзяць па карчмам!

## З Міншчыны.

### Новые школы.

С 1-го ліпня гэтаго году аткрыецца у Несьвіжы мужчынская і жаноцкая гімназія, а ў Барысаве жаноцкая вучыцельская сэмінарыя.

### Град.

У Бабруйшчыне каля Гнедава, Дарошкавіч і Крываносоў была улева з градам. Град выбіў збожжэ на прасторы 500 дзесяцін, папсаваў сады і гароды.

### Пажары.

= У вёсцы **Бараўцы**, беларучскай воласці, с коміна узняўся пажар; згарэло 8 дамоў і 25 халодных будынін. Страт налічаюць на 17,000 руб.
= У в **Озломлі**, осов. вол. Бабруйск. пав. згарэло 26 дамоў.
= У в. **Падлесьсе**, ляхавічоўскай вол. Слуцк. пав., згарэло 12 дамоў.

### Змаганьне с пьянствам.

У апошніе часы у **Барысоўскім і Бабруйскім** паветах адбываліся многалюдные сходы на каторых селяне вынасілі пастановы аб закрываньню манаполек. У 106 сёлах і вёсках пастаноўлена закрыць манапольні і піўные. На сходах многа дзе пастанаўлялі селяне самі пільнаваць каб не было тайнай прадажы гарэлкі.

= У вёсцы **Якшыцы** рэчыцкаго павету, пастаноўлена сходам закрыць манапольку.
= У мястэчку **Новая Мыш**, навагрудзкаго павету, мейсцовые жыды сабраўшыся у школі, пад «хэйрымам» (прысягай) пастанавілі ня толькі не займацца тайнай прадажай гарэлкі, але нават пастанавілі выдаваць паліціі тых жыдоў, каторые будуць гэтым займацца.
= У мястэчку **Гарадышчы**, навагрудзк. пав. сход пастанавіў у межах сваей воласці пазакрываць усе тракціры і піўные, а у манапольках аграпічыць прадажу гарэлкі.

### З Ігуменскаго павету.

Наш павет закінутый між лясоў і балот, мала-памалу пачынае прынімаць людзкі выгляд. Гады тры таму назад правялі новую чугунку ад станціі Градзянка да ст. Церыц Л. Р. ж. д. і такім парадкам многім і многім сотням людзей скарацілі дарогу, бо перш кожны, хто хацеў папасці на чугунку павінен быў ехаць у Бабруйск, за вёрст 50—70. Апошнімі часамі пагаварываюць, што ужо у Пецярбурзі зацьвердзілі праект новай лініі—Смолевічы—Раванічы—Бярэзіна. Гэта лінія нават прыгадней будзе для тутэйшай мейсцовасці, бо будзе. даходзіць да мястэчка Бярэзіны, дзе працекае рэка Бяроза і дзе гандэль шыбка расце. Затое у нас грунтавые дарогі — не прывядзі Божэ! Ешчэ летам так сяк, але вясной і восеньню можна утапіцца у гразі на дарозі. Грэблі ня строены, масты параскіданы. Каму прыходзілося хоць раз праежджаць вясной, напрыклад праз аколіцу Гіджгайлоў, або Сялібу, той пэўна не раз кляў — але каго? — Перш клялі памешчыка, а цяпер «тых паноў, што сідзяць у тым.. земстві», — кажуць у «тым», бо яго ніхто не бачыць, сядзіць сабе у Ігумені і аб нас не дбае. Чуў я, што пры земстві ёсьціка і нейкі інжынер, каторы павінен аб'ежджаць дарогі і строіць іх, але запраўды ня ведаю ці налічым з адзін дзесятак чэлавек з нашаго кутка, што бачылі яго на свае

---

Хмаркі:—быў і я у тых краёх, адкуль прыблукалася і імасць. Там — гаворыш — шчасьце? А што ж па твоему нешчасьце? Там пале выплакалі апошніе сьлёзы, каб даць табе жыцьцё, шчаслівая Хмарка! І цяпер там навет расы не бывае ніколі... Але не для таго назначаліся слёзы, каб радзіць цябе на сьвет для бадзяньня па чужых краёх... І доўга ешчэ гаманіў Арол, нарэкаў на Хмарку.

Слухала Хмарка нарэканьня Арла, і прыкра зрабілося ёй. Прайшла ноч, зачаўся новы дзень, зноў пашла у дарогу Хмарка. Цяпер яна ужо ня чула сябе шчасьлівай і вольнай, як наўперад: так глыбока запалі ёй арловы словы Дні йшлі, праходзілі нядзелі, а яна, як заклятая, ўсё хадзіла па сьвеці. І дзе толькі не была яна! Якога гора, не прышлося зажыць ёй у дарозі! Насілася яна над пустэчамі, перад ёю расціляліся моры, каторые ня мелі берагоў. Ганялі яе вятры, рвалі на кусочкі яе тонкіе валаконцы. І нідзе на свеці не было ёй супакою. І вярнулася яна зноў у той край, адкуль і вышла. Пажоўклые пале, сухіе травы, пагарэлая збажынка гаротна віталі Хмарку, цяпер ужо непатрэбную ім. Жаль, вялікі жаль, агарнуў Хмарку; пацямнела яна, зажурылася, папускала пасмы хмарак і заплакала халоднымі слязмі над роднымі палямі...

---

Стары Дуб, абмыўшыся дажджом, павесялеў, як бы чарку выпіў, і сказаў да Бусла, с каторым даўно ужо быў у дружбе:

— От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружэ, каб ня лёталі дарэмна па сьвеці, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнаго.

Бусёл маўчаў. Відаць, ён йначэй пазіраў на гэту з'яву, а можэ і не дачуў слоў сваіго сябры.

**Тарас Гушча.**

# КРЫКНУЎ БЫ ЗДАЕЦЦА...

Ёсьць розные людзі на сьвеці. Ёсьць бедные і багатые, брыдкіе і харошые.—Гэта матэрьяльнае.—Але ёсьць у чэлавека душа, сумленьне і тут так сама ёсць бедные душою, ёсьць і багатые, благіе і добрые, брыдкіе і прыгожые. Ёсьць ешчэ людзі для каторых матэрьяльнае не істнее. Якбы яго саўсім німа на сьвеці. Жывуць гэтые людзі жыцьцём духовым. Рожные ёсьць: адзін набывае багацьце, другі бяднее. Трэйці дабрату пашырае, а чацьвёрты зло. Пяты хварбамі прыгожымі жыцьцё убірае, а шосты брудзіць яго. І усякі з іх, (калі так можна сказаць), шчасьлівы, не так як у жыцьці матэр'яльным, калі ён толькі горача выпаўняе працу сваю. Праца духовая, найважнейшы фундамэнт жыцьцёвы. Ды толькі ёсьць ешчэ і такіе людзі, каторые хучуць выбраць добры грунт, каб закладаць фундамэнт. Бо зразумелі яны, што калі грунт кепскі, то будынак абрушыцца ешчэ на палові работы. І ня робяць нібы нічога гэтые людзі, яны шукаюць грунту. Ходзюць ад хаты да хаты, ад гаспадара да гаспадара і дапытываюцца — ці німа такога поля і усюды чуюць адказ: Не німа, бо там жыта пасеяў, а там бульбу пасаджу, там пуставаць павінна рок, а там сьвіней буду пасьвіць. Маю малы кавлачак, за выганам каля балотца, дрыгвіны, пакуль што мне ня трэба,—гэта магу пазычыць . . . .

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Але не трасучае балота патрэбна для будынку адказывае такі чэлавек і ідзе далей. Ходзіць доўгі час, а калі пачуе, што ногі яго забалелі—прысядзе, а думкі тагды, як вароны чорные на падаль прылетаюць да яго і кружуцца кружуцца над бедным. Каркаюць вароны. Чым больш гэты чэлавек адпачывае, тым больш баіцца гэтых варон. А павінен адпачываць, бо баляць ногі. Баляць як кожнаму жывому стварэньню, калі яно цяжка працуе. А ён як і кожны ня можэ ісьці без перэстанку. А адпачываць ешчэ цяжэй. Бо калі гэта ужо падаль, то яна ня чуе гэтай зграі варон, наляцеўшых на яе, але, калі жывы убачыць, пачуе гэту зграю, то страшна гэта.

І сілы бываюць рожные. Адна сіла крапчэйшая, а другая слабейшая. Слабейшы хутчэй паддаецца, як крэпкі. А не дай Бог нікому аслабець душою, ці слабым нарадзіцца. Такі чэлавек ня можэ жыць, і не мае адвагі памерці. Ён рухаецца, але ён падаль. І чуе ён, як вароны крычаць, каркаюць над яго трупам. Не прыятна яму гэта, але звыкаецца на час. Пасьля зноў туляецца і так бяз конца. Шкада яго, шкада вельмі. Гэтаго пачуцьця і пяром ня выкажэш. А хто вінават? Ён ці не? Людзі ці так хто? Німа атказу. Ен і сам ня ведае.

Як сьвет шырокі, так многа гэных трупоў жывых на прыдаразі лягло. І ісьці німа як другім.

Шкада таварышоў, шкада бязмерне. Крыкнуў бы здаецца, каб скура зямлі затраслася, каб зоры фальшываго сьвету пагасьлі... ды замоўчыш толькі голасна... Так голасна, што у вачах пацямнее, ды у вушах зазьвініць...

І чэкаеш, што далей будзе?..

**І. Піліпоў.**

